УДК 811.161.3’373

# ГУТАРКОВЫЯ СЛОВЫ З ЭКСПРЭСІЎНЫМ ЗНАЧЭННЕМ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РАМАНА І. ШАМЯКІНА «СНЕЖНЫЯ ЗІМЫ»)

***В. А. Бандарэнка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***А. М. Шубадзёрава***,
канд. філал. навук, дацэнт

Вобразнасць з’яўляецца кампанентам экспрэсіўнасці. Мэта выкарыстання вобразнага значэння заключаецца ў тым, каб вербальна выразіць эмацыянальныя адносіны адрасанта да прадмета маўлення і даць яго ацэнку.

Самым вялікім пластом экспрэсіўных слоў у рамане І. Шамякіна «Снежныя зімы» з’яўляюцца дзеясловы. На аснове адрозненняў экспрэсіўнай дзеяслоўнай дэнататыўнай семантыкі можна выдзсліць групу дзеясловаў, якія абазначаюць дзеянне, стан, утвораныя чалавекам ці адчувальныя ім. Сюды адносяцца лсксіка-ссмантычныя групы дзеясловаў руху і маўлення як найбольш пашыраную і змястоўную ў рамане І. Шамякіна.

1. Група дзеясловаў са значэннем ‘перамяшчэння ў прасторы’, дзе ў якасці нейтральных слоў-ідэнтыфікатараў выступаюць дзеясловы *ісці, бегчы, увайсці* і г.д. Дадзеная група дзеясловаў выкарыстоўваецца пісьменнікам не толькі дзеля паказу хады чалавека, яго перамяшчэння, але і для раскрыцця асаблівасцей

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

псіхалагічнага або фізічнага стану персанажаў: рашучасці, упэўненасці і інш. Такія дзеясловы выражаюць розную ступень інтэнсіўнасці дзеяння (***драпаць, выскачыць, цягнуць, уварвацца, наскочыць***);

2. Групы дзеясловаў са значэннем экспрэсіўнага маўлення, што ідэнтыфікуецца дзеясловамі *гаварыць, крычаць, сварыцца* і інш. (**вярзе, балбатаць, хіхікаць, хмыкаць, зубаскаліць**). Для характарыстыкі сілы гучання І. Шамякін выкарыстоўвае такія дзсясловы-экспрэсівы, як ***рагатнуць, гырчэць, заесціся***.

Такім чынам, маўленчы фон стварае спрыяльныя ўмовы для актуалізацыі эмацыянальнага перажывання чалавека, яго суб'сктыўных адносін да прадмета выказвання. Але гэтыя лексічныя адзінкі актуалізуюць эмоцыю не самі па сабе, а толькі як кампанент агульнага экспрэсіўнага кантэксту.

**Літаратура**

1. Шамякін, І. Снежныя зімы. Раман / І. Шамякін. – Мінск : Беларусь, 1970. – 114 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова